*Ганна СКАРЖЫНСКАЯ-САВІЦКАЯ*

# Сябры



Данік, Віталік і Цімка жывуць у сучасным прыгожым аграгарадку. Хлопчыкі сябруюць з маленства. Разам хадзілі ў дзіцячы садок, гулялі неразлучна ў пясочніцы: ляпілі бабкі, будавалі домікі. У школу пайшлі таксама ў адзін год і ў адзін клас. Школа знаходзілася далёка — на другім канцы аграгарадка. Таму, каб не спазніцца на заняткі, прыходзілася ўставаць рана. Але хлапчукі знайшлі кароткі шлях — праз поле. Яны заўсёды бадзёра крочылі ў школу і дамоў. Старанна вучыліся, падтрымлівалі адзін аднаго.

Вясною і ўвосень хадзіць было добра па вытаптанай сцяжынцы, а вось зімою замяце ўсё снегам, і не прабрацца. Ды яшчэ мароз!

Аднойчы зімовым сцюдзёным днём вярталіся сябры са школы. Вытаптаная раніцай сцежка была замецена снегам. Данік ішоў першы, за ім Віталік і Цімка. Віталік заўважыў, што Данік ідзе і хавае рукі ў кішэні, а потым расцірае іх.

— Чаму ты рукавіцы не надзенеш? — спытаў сябрук.

— Я іх, напэўна, у парце забыў, а можа, і згубіў, — адказаў Данік.

— Ты так можаш рукі змарозіць, — зірнуў на яго Цімка. — Бяжы ў школу і пашукай.

— Не, не пабягу, — адмовіўся Данік, — мы ўжо шмат дарогі прайшлі. Ды і вы на марозе чакаць не будзеце, змерзнеце. Дайду як-небудзь. Буду расціраць рукі.

— Ну, як сабе хочаш, — сказаў Цімка і засунуў свае рукі глыбей у цёплыя футравыя рукавіцы.

А Віталік зняў сваю рукавіцу з правай рукі і працягнуў Даніку:

— На, пагрэй правую руку, а затым я табе дам на левую. Будзем мяняцца — не змерзнем, — падбадзёрыў сябра хлапчук.

А Цімка падумаў: «Во, дзіўны гэты Віталік — сам рукі змарозіць. А я не дам ніводнай рукавіцы. Мне і самому холадна».

Сябры ўсю дарогу мяняліся рукавіцамі.

— Ведаеш, Данік, у мяне ёсць прадзед-ветэран, — сказаў Віталік, — ён ваяваў у Вялікую Айчынную вайну. І расказваў шмат выпадкаў, як яны з сябрамі на вайне і пасля вайны выручалі адзін аднаго. Цяпер яны ўжо зусім старэнькія, але таксама дапамагаюць адзін аднаму. Я разумею — вось гэта сяброўства на ўсё жыццё!

— І ў майго таты ёсць надзейны таварыш. Ён яму як брат. Яны разам у арміі служылі. Дзядзька Марат жыве на поўдні каля мора. Мы кожнае лета ездзім да яго адпачываць. А гэтым летам ён са сваёй сям'ёй прыедзе да нас. Дзядзька Марат вельмі любіць рыбачыць. А ў нас улетку, сам ведаеш, колькі рыбы!

Цімка ішоў за імі і маўчаў. Яму не падабалася гэтая размова.



Малявала Я. Арыко

Як ты думаеш, чаму Цімка застаўся незадаволены размовай сяброў?







Каму з сяброў-снегавічкоў належыць цень?




Малявала В. Чарняева

Злучы словы так, каб у цябе атрымаліся прыказкі пра сяброўства — тры на беларускай мове і тры на рускай.

Дружба | солі. | Дерево | а | не | Сяброўства | без | ищи, | ежа | жизни | сцены. | друзьями. | што | в | Нет | у | знойдзеш. | за | сябра, | туго. | друга | человек – | нашёл – | мацней | лесе | Чалавек | корнями, | Без | каменныя | держится | грыб, | береги. | не | друга – | без